УДК 655.11(476)

# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў КНІГАВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЕ БССР (1919 – 1941 гг.)

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*Разглядаецца накіраванасць дзяржаўнай палітыкі з 1919 па 1941 год у кнігавыдавецкай справе БССР з вылучэннем асноўных этапаў: у 1919 – 24 гадах суіснавалі дзяржаўная, кааператыўная, прыватная формы кнігавыдавецтва; у 1925 – 1929 – адбывалася ўмацаванне дзяржаўнага сектара, аднак за выдавецтвамі захоўвалася пэўная доля самастойнасці; у 1930 – 1935 – удасканальваўся механізм падсправаздачнасці выдавецтваў партыйна-дзяржаўным органам; у 1936 – 1941 – была канчаткова створана цэнтралізаваная кнігавыдавецкая сістэма. Накіраванасць і змястоўнасць кнігавыдавецкай палітыкі ў БССР залежылі ад грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў краіне, установак камуністычнай партыі аб ролі і месцы літаратуры ў сацыялістычным грамадстве.*

**Уводзіны.** Кнігавыдавецкая прадукцыя, якая выходзіла ў 1920 – 1930-я гады ў БССР, з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння працэсаў, што адбываліся ў беларускім грамадстве ў той час, а даследаванне накіраванасці дзяржаўнай палітыкі ў кнігавыдавецкай справе БССР дазваляе выявіць важны аспект у фарміраванні савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў Беларусі. Для ўлады было вельмі важным, каб насельніцтва разумела, прымала і ўдзельнічала ў тагачасных эканамічных, культурных і іншых пераўтварэннях. У сувязі з гэтым мянялася роля і месца кнігі ў сацыяльнай сістэме, а разам ствралася адмысловая арганізацыйная структура кнігавыдавецкай справы, адпаведнае матэрыяльна-тэхнічнае і кадравае яе забеспячэнне. Станаўленне і развіццё новай кнігавыдавецкай сістэмы стала галоўнай мэтай дзяржаўнай палітыкі ў кнігавыдавецкай справе БССР, якая ў сваю чаргу вызначалася з агульнасавецкага цэнтра і кантралявалася партыйнымі органамі.

Прапанаваная перыядызацыя дзяржаўнай палітыкі ў кнігавыдавецкай справе БССР грунтуецца на наступных палажэннях: 1) палітыка ў кнігавыдавецкай справе БССР на працягу даследуемага перыяду мела тэндэнцыю ўзмацнення дзяржаўнага кантролю над кнігавыданнем; 2) у аснову перыядызацыі пакладзены: ступень удзелу дзяржавы ў працэсе кнігавыдавецтва, змены ў асноўных структурных элементах кнігавыдавецкай сістэмы БССР: кадравае забеспячэнне, матэрыяльна-тэхнічная база, змест рэдакцыйна-выдавецкіх планаў; 3) пачатак першага этапа і заканчэнне чацвертага акрэслены храналагічнымі межамі: 1919 год – стварэнне БССР, 1941 – пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

**Першы этап (1919 – 1924 гг.)** характарызуецца пераходам ад цалкам падпарадкаванай дзяржаве выдавецкай дзейнасці да суіснавання дзяржаўнай, прыватнай, кааператыўнай форм арганізацыі кнігавыдавецтва.

Ва ўмовах ваеннага камунізму дзяржаўны сектар быў прадстаўлены рэгіянальнымі аддзяленнямі Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР, якія з'яўляліся адзінымі заказчыкамі Паліграфічнага аддзела пры Вышэйшым Савеце Народнай Гаспадаркі Беларусі (кіраваў нацыяналізаванай маёмасцю з ліпеня 1920 года). Выпуск і тэматыка кніг рэгуляваліся выключна дзяржаўнымі органамі. Мясцовыя друкарні былі заняты тэрміновым выпускам агітацыйнай літаратуры, у якой асвятляліся тагачасныя рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Толькі дзякуючы намаганням групы дзеячоў на чале з З. Жылуновічам былі выдзелены сродкі на выкарыстанне замежнай паліграфічнай базы для выпуску друкаванай прадукцыі на беларускай мове.

Права на легальнае карыстанне паслугамі кнігавыдавецкага сектара забяспечвала толькі прыналежнасць да кіруючай партыі і падтрымка яе палітыкі.

Па меры ажыццяўлення новай эканамічнай палітыкіназіралася вяртанне да прыватных форм арганізацыі выдавецкіх прадпрыемстваў і пошук новых. Гэта прывяло да кароткатэрміновага суіснавання трох разнавіднасцей – дзяржаўнай, прыватнай і кааператыўнай, што ў сваю чаргу азначала з'яўленне выдавецтваў, якія былі арыентаваны на задавальненне інтарэсаў розных груп насельніцтва. Аднак умовы існавання для дзяржаўнага і прыватнага сектара былі неаднолькавыя.

Папярэдні і паследуючы прагляд кнігавыдавецкай прадукцыі з 1923 года набывае сістэматычны характар, што было звязана з стварэннем Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў БССР (Галоўлітбел). Яно выдавала дазвол на права выдання, на заснаванне новых выдавецтваў у рэспубліцы, складала спісы забароненых твораў друку, распрацоўвала абавязковыя для ўсіх выдавецтваў правілы і распараджэнні. Галоўлітбел быў дзяржаўным органам і знаходзіўся ў агульных арганізацыйных рамках Наркамасветы БССР. У акрэслены перыяд у калегіі Галоўлітбела пераважалі прадстаўнікі савецкіх дзяржаўных органаў, літаратуры, навукі, мастацтва. Цэнзурныя абмежаванні былі нязначнымі, як і выпадкі канчатковай забароны да друку. Кантроль за кадрамі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі, іс-

навання кааператыўных і прыватных выдавецтваў, адбываўся праз аддзелы размеркавання працы пры Наркампрацы і яго мясцовых органаў. Каб вырашыць пытанне з забеспячэннем высокакваліфікаванымі кадрамі выдавецтваў, практыкавалася прыцягненне да працы тых, хто працаваў на падобных прадпрыемствах яшчэ да рэвалюцыі. Разам з тым, каб выдавецтвы ў сваёй дзейнасці не адыходзілі ад партыйнай лініі, у абавязковым парадку ў склад праўлення ўводзілі прадстаўніка камуністычнай партыі. 22 лютага 1924 года была прынята пастанова ЦК РКП(б), у якой падкрэслівалася, што партыйныя камітэты павінны ўсталяваць пастаяннае кіраўніцтва над «сильно развившейся работой издательств, в первую очередь в области массовой литературы, учебников, крестьянской и национальной печати» [1, с. 311]. Яна прадвызначыла злучэнне прыватных, кааператыўных выдавецтваў з дзяржаўным сектарам. У верасні 1924 года ў БССР, нягледзячы на адсутнасць адзінства ў думках паміж Наркамасветы БССР і партыйнымі органамі КП(б)Б, было прынята рашэнне аб аб’яднанні буйнейшага кааператыўнага выдавецтва «Савецкая Беларусь» і Белтрэструка (знаходзіўся пад патранажам КП(б)Б) у Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, якое пачало функцыянiраваць з 1925 года і стала буйнейшай выдавецкай установай БССР (у адміністрацыйна-арганізацыйных адносінах падпарадкоўвалася Наркамату асветы БССР, у ідэалагічных – партыйным органам) – цэнтрам, які злучаў выдавецкую, паліграфічную і камерцыйную дзейнасць. З гэтага часу можна казаць аб **другім этапе (1925 – 1929 гады)**, калі ў выніку эканамічных і ідэалагічных абмежаванняў прыватныя і кааператыўныя выдавецтвы паступова пачалі злучацца з дзяржаўным сектарам. Функцыі ўпраўлення перайшлі да новых спецыяльных органаў (аддзел друку ЦК КП(б)Б, камітэт па справах друку і паліграфічнай прамысловасці пры СНК БССР, камітэт па справах друку пры Наркамгандлі, спецыяльныя камісіі і інш.).

У другой палове 1920-х гадоў адбыўся падзел выдавецтваў, у аснове якога ляжалі жанравыя асаблівасці кніжнай прадукцыі. Рэдакцыйна-выдавецкія планы сталі арыентавацца на забеспячэнне патрэбаў розных сацыяльных слаёў, узроставых і прафесійных груп і нацыянальныя патрэбы насельніцтва БССР. На змястоўнасць і арганізацыю кнігавыдавецкай справы вельмі паўплывала палітыка беларусізацыі, якая заклала нямала новых акцэнтаў у нацыянальна-культурнае будаўніцтва. Увайшло ў практыку абавязковае выдзяленне ў рэдакцыйна-выдавецкіх планах пэўнай колькасці кніжнай прадукцыі для нацыянальных супольнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі рэспублікі. У межах Беларускага дзяржаўнага выдавецтва былі створаны нацыянальныя аддзелы, якія адказвалі за выпуск літаратуры на мовах нацыянальных меншасцей БССР. Узрасла ўвага да нацыянальнага складу працоўных.

У адзначаны перыяд адбылося ўзмацненне матэрыяльна-тэхнічнай базы за кошт паліграфічных магчымасцей Віцебскай і Гомельскай губерняў. Пасля ўзбуйнення на тэрыторыі БССР найбольшымі выдавецкімі магчымасцямі валодалі БДВ, Палесдрук і Магілёўская друкарня.

Паступова ўдасканальвалася сістэма ідэалагічнага і палітычнага кантролю за друкаванай прадукцыяй. З другой паловы 1920-х гадоў Галоўлітбел стаў падпарадкоўвацца аддзелу друку ЦК КП(б)Б. Апошні разам з рознымі камісіямі павінен быў адказваць за паслядоўнае правядзенне палітыкі партыі ў кнігавыдавецкай справе БССР. Галоўлітбел вызначаў ступень прыдатнасці той ці іншай кнігі ў залежнасці ад таго, для якой катэгорыі насельніцтва яна прызначалася. Тым самым ён уплываў на змест рэдакцыйна-выдавецкіх планаў і каардынаваў кнігавыдавецкую справу. На гэтым этапе свайго развіцця Галоўлітбел праяўляў адносную памяркоўнасць да твораў, якія траплялі да яго на папярэдні прагляд, пазбягаючы метаду безагаворачнай забароны. Кнігі, якія выклікалі незадавальненне Галоўлітбела, адпраўляліся на дапрацоўку або на іх накладаліся эканамічныя санкцыі: кошт штучна завышаўся, а тыраж зніжаўся да мінімуму. На дадзеным этапе кнігавыдавецтвы валодалі пэўнай доляй самастойнасці ў ажыццяўленні сваёй дзейнасці. У складаных эканамічных умовах, у другой палове 1920-х гадоў актыўна паводзілі сябе прафсаюзы друкароў, якія пад пагрозай забастовак неаднаразова прымушалі кіраўніцтва выдавецтваў ісці на ўступкі.

К канцу 1920-х гадоў сітуацыя змянілася. На XVI канферэнцыі УКП(б) і V з’ездзе Саветаў СССР быў прыняты першы пяцігадовы план развіцця, які з’явіўся пабуджальным момантам да цэнтралізаванага, строга планавага развіцця ўсяго СССР, у тым ліку і БССР. У 1929 годзе была згорнута новая эканамічная палітыка, пачалося адмаўленне ад, няхай і абмежаваных, дэмакратычных прынцыпаў кіраўніцтва дзяржавай. Менавіта з 1929 года вядучай тэндэнцыяй дзяржаўнай палітыкі ў культурнай сферы, у тым ліку і ў кнігавыдавецтве, стала «пралетарызацыя» культуры і выцясненне дэмакратычных праяў. Сутыкненне эканамічных і палітычных інтарэсаў прывяло да вялікай запазычанасці выдавецтваў.

На працягу **трэццяга этапа (1930 – 1935 гады)** удасканальваўся механізм падсправаздачнасці выдавецтваў партыйным органам. Пачаткам карэнных змяненняў у кнігавыдавецкай справе можна лічыць святкаванне 5-гадовага юбілею Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, падчас якога разам з станоўчымі вынікамі, былі агучаны недахопы ў дзейнасці галоўнага выдавецтва краіны, што прадвызначыла змены ў яго працы. Галоўнымі патрабаваннямі да кніжнай прадукцыі сталі ідэалагічная вытрыманасць і класавы характар твораў. Зніклі кнігі, якія складалі аснову выдавецкіх планаў на працягу 1920-х гадоў (амаль усе падручнікі па беларускай мове, гісторыі, геаграфіі, слоўнікі, многія творы мастацкай літара-

туры), бо сталі супярэчыць падыходам партыйных органаў і былі абвешчаны ці апалітычнымі, і таму непатрэбнымі, ці ідэалагічна невытрыманымі і варожымі.

У дадзены перыяд адбывалася мадэрнізацыя паліграфічнай прамысловасці БССР. Сродкі, якія ўкладвалі ў яе развіццё, прывялі да адчувальных зрухаў і больш прыстасавалі яе да выпуску кніжна-часопіснай прадукцыі.

Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай справе БССР атрымала новы змест, што ў першую чаргу адбілася на рэдакцыйна-выдавецкіх планах. Пастановай ЦК УКП(б) ад 15 жніўня 1931 года «Аб выдавецкай рабоце» быў замацаваны новы статус кнігі – яна павінна быць моцным сродкам выхавання, мабілізацыі і арганізацыі мас вакол задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва [2, с. 52]. Тэматычныя планы выдавецтваў мэтанакіравана змянялі ў бок павелічэння дэнацыяналізаваных «сацыяльна важных» выданняў, якія выключалі ўсялякую ідэалагічную няпэўнасць. Згодна з рашэннем ЦК КП(б)Б ад 6 кастрычніка 1931 года, Беларускае дзяржаўнае выдавецтва было перайменавана ў Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі [3, с. 25]. На першы план у рэдакцыйна-выдавецкіх планах выйшла палітычная і тэхнічная літаратура. Больш жорсткімі сталі ідэалагічныя абмежаванні.

У дадзены перыяд кардынальна змяніліся метады працы Галоўлітбела. Следам за рэарганізацыяй Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі ў ім было створана тры групы: па кантролю за палітыка-эканамічнай літаратурай; за мастацкай, дзіцячай, педагагічнай літаратурай; па кантролю за ўсімі выданнямі з пункту гледжання захавання ў іх дзяржаўных тайнаў. Гэта дало магчымасць удасканаліць папярэдні і паследуючы палітыка-ідэалагічны кантроль за дзейнасцю выдавецтваў. Супрацоўнікі Галоўлітбела неслі прамую адказнасць перад партыйнымі органамі за пропуск да друку антысавецкіх твораў.

Памяркоўная палітыка ў адносінах да кадравага складу кнігавыдавецтваў замянялася рэпрэсіўнымі метадамі. Адпаведныя дзяржаўныя органы ўзялі пад нагляд фармаванне кадравага складу кнігавыдавецкага сектара. Яны пільна сачылі за рабочымі і служачымі кнігавыдавецкага сектара ўсіх узроўняў, сістэматычна збіралі звесткі пра палітычны стаж, працу і літаратурную дзейнасць супрацоўнікаў выдавецтваў. Ідэалагічная адпаведнасць стала галоўнай пры прызначэнні на пасаду. Паступова пачалі пазбаўляцца ад тых, да каго звярнуліся па дапамогу ў 1920-я гады, калі кваліфікаваных кадраў пралетарскага паходжання не хапала. Пасля справы «Саюз вызвалення Беларусі» кадравы склад выдавецтваў, у першую чаргу Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, быў вызвалены ад нацыянальна-арыентаваных дзеячоў. Узмацніўся нагляд за кнігавыдавецкім сектарам з боку органаў КП(б)Б, якія ў сваю чаргу падпарадкоўваліся дырэктывам агульнасавецкага цэнтра. Кіруючыя ўказанні вышэйшых органаў былі абавязковымі для выканання і з большасці не ўлічвалі асаблівасці БССР. У пачатку 1930-х гадоў па загаду з цэнтра, аддзелы Дзяржвыдавецтва БССР па наступных галінах кніжнай прадукцыі: партыйнай і палітмасавай літаратуры, вучэбнай і педагагічнай, мастацкай, ваеннай і г.д., былі ператвораны ў самастойныя выдавецтвы. Аднак штучна створаныя выдавецтвы не мелі дастатковага матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння, займаліся пераважна перакладам рускамоўных кніг (што ў сваю чаргу павышала сабекошт друкаванай прадукцыі). Каб выканаць абавязковы план, павышалі тыраж, выпускалі недабраякасную прадукцыю. Перавага дзяржаўных планаў над рэальным попытам прыводзіла да затаварвання кніжнага рынку, што ва ўмовах гаспадарчага разліку азначала ператварэнне выдавецтваў у крэдытна няздольныя гаспадарчыя адзінкі. З большасці паліграфічныя прадпрыемствы існавалі толькі дзякуючы дзяржаўным датацыям. Такая крызісная сітуацыя была справакавана сутыкненнем эканамічных і палітычных інтарэсаў, што прывяло да невырашальнага канфлікту, у якім апошняе слова засталося за палітычнымі інтарэсамі.

Да 1935 года скончыліся спробы рэфармавання кнігавыдавецкага сектара, быў канчаткова вызначаны курс на фарміраванне цэнтралізаванай кнігавыдавецкай сістэмы.

**На чацвёртым этапе (другая палова 1930-х гг.)** у выніку мэтанакіраванай дзяржаўнай палітыкі была створана цэнтралізаваная кнігавыдавецкая сістэма, дзейнасць якой цалкам кіравалася і планавалася партыйна-дзяржаўнымі органамі. Менавіта ў 1936 годзе рэпрэсіўная палітыка (асноўнымі матывамі для звальнення, акрамя «контррэвалюцыйнай» дзейнасці, было палітычнае мінулае і сваяцтва з «ворагамі» народа) прывяла да вострай праблемы забеспячэння кадравага складу выдавецтваў. Калі раней ЦК КП(б)Б вырашала кадравае пытанне шляхам перамяшчэння работнікаў і прасоўваннем слаба падрыхтаваных на кіруючыя пасады, то цяпер гэта стала немагчыма, бо патрабавалася адразу вялікая колькасць людзей. Аднак справа была не столькі ў недахопе адпаведных людзей у межах Беларусі, колькі ў тым, што рэпрэсіўная кадравая палітыка ў кнігавыдавецкай справе прывяла да нежадання займаць адказныя пасады. Так, напрыклад, у верасні 1936 года на Бюро ЦК КП(б)Б на пасаду намесніка дырэктара Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі быў прапанаваны для зацвярджэння І. Раманчук, які да гэтага працаваў дырэктарам музея Рэвалюцыі [4, л. 80]. Каб пазбегнуць небяспечнага прызначэння, ён у якасці прычыны спасылаўся на тое, што стан здароўя, у першую чаргу слабая нервовая сістэма, не дазваляе займаць такую адказную пасаду. Пытанне кадравага забеспячэння кнігавыдавецкага сектара было вырашана шляхам збору больш менш кваліфікаваных работнікаў друку з усяго СССР, што змяніла накіраванасць, а разам з ёю і змястоўнасць кнігавыдавецкай справы краіны [5, с. 125 – 126].

Разнастайнасць кніжнай прадукцыі абмяжоўвалася дзяржаўнай палітыкай. З 1936 года значна павялічылася колькасць выданняў на рускай мове. Гэта было звязана з палітыкай атаясамлення паняццяў «савецкі» і «рускі». З гэтага часу сталі назірацца перамены ў дзейнасці Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі: скараціўся аб'ём выдання арыгінальных твораў беларускіх аўтараў за кошт павелічэння перакладаў. У 1937 годзе ў БССР быў спынены выпуск літаратуры на польскай мове. Рашэнне аб ліквідацыі адпаведнага аддзела ў структуры ДВБ, Бюро ЦК КП(б)Б прыняла пасля даклада аддзела друку і выдавецтваў ЦК КП(б)Б аб тым, што кадры польскіх паэтаў і пісьменнікаў БССР нязначныя і засмечаныя варожымі элементамі. Гэта рашэнне дало аб сабе знаць у 1939 годзе, калі на кіраўніцтва БССР была ўскладзена ліквідацыя дэфіцыта літаратуры на польскай мове, які абвастрыўся ў выніку чысткі літаратурнага фонду ад «варожых» твораў у Заходняй Беларусі. Сярод выданых кніг на польскай мове пераважала агітацыйна-прапагандысцкая, палітычная літаратура.

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР паліграфічныя прадпрыемствы дадзенага рэгіену былі нацыяналізаваны і перададзены спачатку ў вядзенне абласных часовых упраўленняў, а затым пасля стварэння органаў савецкай улады – мясцовым органам кіравання [6, с. 470]. Пачалася складаная работа па ўключэнню гэтага рэгіёну ў новую палітычную сістэму і сацыяльную рэчаіснасць. Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай сферы была накіравана на ліквідацыю непрымальнай з пункту ідэалагічных пазіцый літаратуры і замену новай адпаведнага зместу.

З другой паловы 1930-х гадоў павялічыўся апарат Галоўлітбела і пашырылася поле яго дзейнасці. Было наладжана бесперапыннае ажыццяўленне папярэдняй і далейшай цэнзуры як у цэнтры рэспублікі, так і ў раёнах. Галоўлітбел канфіскоўваў творы, якія не супадалі з афіцыйнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Яго дзейнасць па фільтрацыі рэдакцыйна-выдавецкіх планаў цалкам рэгламентавалася ў залежнасці ад выдавецкай палітыкі партыі, асноўныя напрамкі якой зацвярджаліся Бюро ЦК КП(б)Б.

На працягу чацвёртага этапа цалкам афарміліся і замацаваліся галоўныя прынцыпы дзейнасці кнігавыдавецкага сектара. Адносіны ўлады да кнігавыдавецкай справы набылі інструментальны характар. Выдавецтвы страцілі права самастойна вызначаць змест сваіх рэдакцыйна-выдавецкіх планаў. Літаратурныя творы павінны былі ўпісвацца ў прапанаваныя ідэалагічныя схемы, адпаведнасць якім забяспечвалі спецыяльныя органы партыйна-ўрадавага кантролю за дзейнасцю выдавецтваў і літаратуры.

**Заключэнне.** Дзяржаўная палітыка ў кнігавыдавецкай справе БССР у 1920-я і 1930-я гады мела істотныя адрозненні. У той жа час прасочваецца пераемнасць у яе ажыццяўленні на розных этапах, выяўляецца яе пэўнае адзінства. Накіраванасць і змястоўнасць кнігавыдавецкай палітыкі ў БССР залежылі ад грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў краіне, установак камуністычнай партыі аб ролі і месцы літаратуры ў сацыялістычным грамадстве.

## ЛІТАРАТУРА


1. Волк, А.А. Из истории издательского дела Белоруссии (1917 – 1925 гг.) / А.А. Волк // Кн.: исследование и материалы; Всесоюз. книж. палата; под ред. Н.М. Сикорского. – М.: Изд-во всесоюз. книж. палаты, 1962. – Сб. 7. – С. 288 – 316.
2. Добренко, Е.А. Формовка советского читателя: социальные и эстетические предпосылки рецепции советской литературы / Е.А. Добренко. – СПб.: Гуманит. агентство «Академический проект», 1997. – 320 с.
3. Дырэктывы партыі аб выдавецкай рабоце. – Менск: ДВБ, 1933. – 48 с.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4-п. – Воп. 3. – Спр. 357. – Пратаколы пасяджэнняў Бюро ЦК КП(б)Б і матэрыялы да іх.
5. Касцюк, М.П. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М.П. Касцюк. – Мінск: ВП «Экаперспектыва», 2000. – 308 с.
6. Марцелев, С.В. Печать Советской Белоруссии / С.В. Марцелев. – Минск: Беларусь, 1967. – 512 с.


*Паступіў 11.03.2010*

**PERIODIZATION OF STATE POLICY IN BSSR BOOK PUBLISHING (1919 – 1941)**

***A. SUMKO***

*The article deals with the trend of the state policy from 1920 till 1941 in the book publishing in BSSR and specifies its main stages: in 1920 – 1924 there existed state, cooperative and private forms of book publishing; in 1925 – 1929 the reinforcement of the state form but publishing houses preserved a certain amount of independence; in 1930 – 1935 the mechanism of subordination of the publishing houses to party and state structures improved; in 1936 – 1941 a centralized book publishing systems was finally created.*